УДК 82-14=161.3

***Базар Наталля***
*Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, Пінск, Беларусь*

# "Я Ў НЕБЕ БАЧЫЎ ЗНАК СКАРЫНЫ": КЛАСІЧНЫ ТРЫЯЛЕТ ВІКТАРА ВАБІШЧЭВІЧА

Артыкул прысвечаны вывучэнню жанравай формы інтэртэкстуальнасці ў творах сучаснага беларускага паэта В. Вабішчэвіча, які, апіраючыся на паэтычныя здабыткі М. Багдановіча, пашырае магчымасці беларускага мастацтва слова. Трыялет В. Вабішчэвіча сведчыць аб багацці мастацкіх выяўленчых сродкаў беларускага аўтара, яго інтэлектуальным і творчым патэнцыяле.

***Ключавыя словы: жанр, інтэртэкстуальнасць, сучасная паэзія, трыялет, Віктар Вабішчэвіч***

Адметнасць сучаснай беларускай паэзіі заключаецца ў спалучэнні і суіснаванні самых розных здабыткаў, якія назапасіла нацыянальная літаратура на працягу свайго існавання. Кожнае дзесяцігоддзе ў літаратуру прыходзяць новыя аўтары, і творчасць кожнага з іх займае пэўнае месца ў беларускім слоўным мастацтве. Пачатак XXI стагоддзя адметны з'яўленнем паэтаў, якія па-свойму абнаўляюць мастацкае бачанне свету, выбіраюць як найноўшыя, так і класічныя мастацкія формы. Сучаснаму паэту вельмі важна, ствараючы новае, не забываць пра літаратурную спадчыну папярэдніх пакаленняў. Сярод такіх аўтараў можна назваць і паэта са Століншчыны – Віктара Вабішчэвіча.

В. Вабішчэвіч – настаўнік гісторыі Давыд-Гарадоцкай сярэдняй школы №1 Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Нарадзіўся ён у вёсцы Рубель, адной з самых вялікіх вёсак Столінскага Палесся. Яшчэ ў школьныя гады захапіўся гісторыяй роднай зямлі, скончыў гістарычны факультэт БДУ. З дзяцінства В. Вабішчэвіч піша вершы. Як ён не раз адзначаў у сваіх інтэрв'ю, што на яго светапогляд і творчасць аказалі значны ўплыў волаты беларускай літаратуры Якуб Колас і Янка Купала, Максім Багдановіч і Уладзімір Караткевіч, Іван Мележ і Янка Брыль. У сям'і Вабішчэвічаў панаваў культ кнігі: маці чытала дзецям казкі, расказвала на памяць вершы беларускіх паэтаў. З вялікай любоўю і пашанай адносіўся да кнігі, да роднай мовы бацька паэта. Таму чацвёра з пяці дзяцей Вабішчэвічаў звязалі свой лёс з беларускай мовай (тры сястры выкладаюць беларускую мову і літаратуру ў

школе, а старэйшы Віктар – гісторыю). Акрамя паэзіі, В. Вабішчэвіч піша гістарычныя і літаратуразнаўчыя нарысы, якія шматразова друкаваліся на старонках часопісаў “Роднае слова”, “Маладосць” і інш. А з 2004 года В. Вабішчэвіч – член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Віктар Вабішчэвіч – адзін з тых паэтаў, якія лічаць сэнсам свайго жыцця служэнне роднаму слову. Першы яго паэтычны зборнік “Чорны боль” убачыў свет у 2003 годзе. У 2006 годзе выйшлі другі і трэці зборнікі “Уражанні” і “Кахаю і люблю”. Чацвёрты зборнік паэзіі “Orbi” (лацінскае слова, азначае “свету”, “міру”) выйшаў з друку ў 2012 годзе.

В. Вабішчэвіч – паэт, які не імкнецца напісаць як мага болей вершаў. Творы паэта дасканала апрацаваныя і надзвычай змястоўныя, над кожным вершам аўтар доўга шчыруе, вывяраючы кожны радок. Па-майстэрску выкарыстоўвае ён магчымасці беларускага слова для стварэння вобразаў, для тлумачэння сваіх пачуццяў, выказвання разважанняў. В. Вабішчэвіч – гэта рамантык і адначасова рэаліст.

Паэзія В. Вабішчэвіча характарызуецца ўменнем паэта карыстацца рознымі паэтычнымі формамі. Сярод яго вершаў шмат трыялетаў, увядзенне якіх у беларускую літаратуру з’яўляецца заслугай Максіма Багдановіча (“Дзераўлянае яечка…”, “Мне доўгае растанне з Вамі…” і інш., 1912-1913 гг.). Трыялет складаецца з 8 радкоў: 1-ы, 4-ы, 6-ы, а таксама 2 першыя і 2 апошнія – аднолькавыя. Гэтая вершаваная форма названа трыялетам, таму што адзін і той жа радок паўтараецца тры разы. Класічныя рыфмавыя схемы трыялета гэта – ABaA abAB, ABbA baAB або ABbA abAB. Доўгі час гэты жанр адносіўся да пацяшальных, забаўляльных паэтычных твораў. Максіму Багдановічу ўдалося надаць трыялету грамадзянскі змест (трыялет С. Палуяну (“Ты быў, як месяц, адзінокі…”).

Паколькі “трыялет па сваёй прыродзе – гэта штучная форма” [6, с. 124], то адной з галоўных задач, якія паўстаюць перад паэтам, з’яўляецца ўменне мастака слова пабудаваць трыялет так, каб яго штучнасць было цяжка або немагчыма заўважыць. Таму да напісання трыялета трэба падыходзіць творча и добра ведаючы законы яго пабудовы. Многія сучасныя паэты ўносяць свае карэктывы, інтэрпрэтуюць трыялет у кантэксце індывідуальных мастацка-эстэтычных пошукаў, тым самым змяняючы яго традыцыйную форму. Таму можна выдзеліць дзве жанравыя формы трыялета: класічны і разняволены.

В. Вабішчэвіч у напісанні сваіх трыялетаў ідзе па класічным шляху. Ён не шукае новыя спосабы разнявалення трыялета, а па-майстэрску апрацоўвае і захоўвае яго класічную форму. Трыялеты В. Вабішчэвіча адносяцца да грамадзянскай, філасофскай, інтымнай

лірыкі. Паэт разважае аб чалавечым жыцці, гаворыць на маральныя тэмы.

Так, у трыялеце *“Душы маёй гучыць маленне”* В. Вабішчэвіч дзеліцца сваёй думкай адносна жыцця ў сучасным грамадстве, дзе пануе здрада, абыякавасць да таго, хто цябе акружае, да навакольнага свету, прыроды. І таму дзень і ноч кожную хвіліну, без перапынку, *“Нястрымна, кожнае імгненне / Душы маёй гучыць маленне. / Як незгасальнае гарэнне”* [5, с. 54]. Малітва душы – гэта зварот да сумлення, якое ёсць у кожнага чалавека, гэта заклік паэта да таго, каб сумленне не задрамала і, што больш жахліва, не ўпала ў глыбокі летаргічны сон, з якога можна і не выйсці. Пакуль у чалавека ёсць сумленне, пакуль чалавек уважлівы і неабыякавы ў адносінах да іншых, будзе жыць яго душа. Калі сумленне засне, то душа паступова стане чэрствай і яе непазбежна чакае смерць. Таму яна, душа, і просіць, звяртаецца ў сваёй малітве да сумлення. Трыялет складаецца з 8 радкоў і пабудаваны на адной рыфме – жаночай, выкарыстаны 4-стопны ямб. Галоўнае патрабаванне да трыялета выконваецца: паўтараюцца 2 першыя і 2 апошнія радкі, а таксама 1-ы і 4-ы.

Максім Багдановіч некалі запытаў: “Нашто ж на зямлі / Сваркі і звадкі, боль і горыч, / Калі ўсе мы разама ляцім / Да зор?” [1, с. 155]. З гэтай думкай класіка поўнасцю згаджаецца і наш сучаснік В. Вабішчэвіч. Жыццё хуткаплыннае, яно – дарога да вечнасці. Такім настроем прасякнуты трыялет “*Нашы вёсны ў вырай адлятаюць”*. Год за годам праходзіць зямное існаванне чалавека: “*Нашы вёсны ў вырай адлятаюць, / Праплываюць, быццам журавы”* [4, с. 56]. Пасля гэтага чалавек адыходзіць у вечнасць: *“Прыйдзе час, яны ў далёкім краі / Знойдуць адпачынак векавы”* [5, с. 56]. І ўсё тое, што было зроблена (добрае і дрэннае), застанецца з ім, бо яго *“Не змахнеш... з галавы”* [4, с. 56]. Таму, пакуль яшчэ ёсць магчымасць выправіць усё кепскае, трэба спяшацца, каб, спаткаўшы *“адпачынак векавы”* [5, с. 56], пакінуць пасля сябе нешта добрае на гэтай зямлі. Патрабаванне да класічнага трыялета выканана: верш складаецца з 8 радкоў, 1-ы, 4-ы і 6-ы радкі аднолькавыя, 2 першыя і 2 апошнія паўтараюцца. Трыялет пабудаваны на чаргаванні жаночай і мужчынскай рыфм, выкарыстаны 5-стопны харэй.

Філасофскім роздумам пра хуткаплыннасць жыцця прасякнуты *“Трыялет у вянок Караткевічу”*. В. Вабішчэвіч называе жыццём *“кароткае імгненне / Ад нараджэння да ўзнясення”* [5, с. 59] і, гаворачы, што *“знікаюць цені пакаленняў”* [5, с. 59], яшчэ раз падкрэслівае хуткаплыннасць чалавечага існавання на зямлі. Чалавек за сваё кароткае зямное жыццё павінен дбаць аб культурнай спадчыне свайго

народа, зрабіўшы ўсё магчымае дзеля яе захавання, дзеля захавання хаця б успамінаў пра яе. Ён павінен пачуць "маленне" святынь, маленне таго, што дорага яго зямлі, людзям, і выканаць просьбу сваіх святынь: *"Святыні стынуць у маленнях: / Уваскрэсні, сыну дай збавенне"* [5, с. 59]. І не проста *"збавенне",* а такое, якое далі Уладзімір Караткевіч і такія ж значныя, як і ён, геніі нашай зямлі. Фармальныя адзнакі трыялета захаваныя і ў гэтым вершы В. Вабішчэвіча.

Эпіграфам да трыялета *"Таго не будзе, пэўна, болей"* нездарма ўзяты радок з эпілога да вершаванага апавядання "Вераніка" М. Багдановіча "Няма таго, што раньш было…". Паэт кажа, што хутчэй за ўсё тое, што пакінута нам ад нашых продкаў і не захоўваецца сёння, паступова можа забыцца чалавекам у віры сучаснага жыцця і ніколі не вернецца: *"Таго не будзе, пэўна, болей, / Што намі трацiцца цяпер"* [5, с. 56]. І ад гэтага не адзін дзень і не адно дзесяцігоддзе будзе балець сэрца неабыякавага да культурнай спадчыны беларуса. Але мы ў сваёй памяці можам і ўсё ж такі павінны захаваць партрэты, радкі, падзеі, як і *"надпіс "Вераніка", / На ліпе ўрэзаны ў кары"* [1, с. 103], якi *"Казаў вачам аб тэй пары"* [1, с. 103]. У трыялеце В. Вабішчэвіча 8 радкоў, дзе 1-ы, 4-ы і 6-ы радкі аднолькавыя, 2 першыя і 2 апошнія паўтараюцца. Пабудаваны 4-стопным ямбам, з выкарыстаннем жаночых і мужчынскіх рыфм.

Добра ведаючы гісторыю сваёй зямлі і адносячыся да яе з павагай, а таксама шануючы родную матчыну мову, В. Вабішчэвіч сцвярджае, што, дзякуючы гэтаму, яму пашчасціла *"ў небе"* [5, с. 54] бачыць *"знак Скарыны"* [5, с. 54] – асветніка і першадрукара зямлі беларускай. А паколькі яму пашчасціла ўбачыць такое цуда, ён будзе да канца сваіх дзён берагчы спадчыну слаўнага сына Беларусі. Такімі ж будуць усе тыя беларусы, якім таксама пашчасціла ці яшчэ пашчасціць убачыць *"знак Скарыны"* [5, с. 54] (трыялет *"Я ў небе бачыў знак Скарыны"*).

Калі захоўваць мінулае, тады і край пачынае квітнець – сцвярджае паэт у трыялеце *"Не кажы, што Беларусь малая…"*. І гэта неабходная ўмова далейшага жыцця радзімы, існавання беларускай нацыі.

З павагай і пяшчотай адносіцца В. Вабішчэвіч да жанчыны. Жанчына – крыніца натхнення, гэта – святло, якое дае душы імгненні радасці ў неспакойным чалавечым жыцці. *"Адчуў я сэрца хваляванне, / І песня набыла дыханне"* [5, с. 55] (трыялет *"Напэўна, сонечнае ззянне"*). Каханне – гэта шчасце, лёгкасць на душы, жаданне абняць увесь свет. Але ж каханне прыносіць чалавеку не толькі радасць, а яшчэ і

перажыванні, горыч, боль: *“Спаткаў цябе я ў цішыні дубровы – / Імгненні радасці і сэрцу – боль”* [5, с. 58] (трыялет *“Спаткаў цябе я ў цішыні дубровы”)*. У вершах пра каханне В. Вабішчэвіч выступіў як тонкі майстар лірычнага слова і як філосаф. Яго герой разумее, што каханне бывае розным: узаемным і без узаемнасці, адкрытым і таямнічым (трыялеты *“Васільковыя вочы каханай”, “Я цябе намаляваў на снезе”, “Твой ліст я аддаю агню”, “Не была маім ты захапленнем”, “Не станеш ты маім каханнем”*).

Такім чынам, трыялеты В. Вабішчэвіча даюць магчымасць паказаць майстэрства аўтара ў гэтым паэтычным жанры, сведчаць пра яго талент, які праяўляецца ва ўменні супастаўляць падзеі мінулага з сучаснасцю, разважаць як філосаф і аб’ектыўна, рэалістычна глядзець на жыццё. В. Вабішчэвіч – тонкі лірык, ён спрабуе зразумець, у чым сутнасць кахання, і зразумець не толькі сэрцам, але і розумам. Гэта паэт, якога цікавяць самыя розныя праблемы. Кожны верш В. Вабішчэвіча добра абдуманы як адносна зместу, так і адносна яго формы. У прааналізаваных трыялетах выканана галоўнае патрабаванне: 1-ы, 4-ы і 6-ы радкі аднолькавыя, 2 першыя і 2 апошнія паўтараюцца. Паэт выкарыстаў харэічны і ямбічны метры (4-стопны і 5-стопны), а таксама дактыль, анапест і амфібрахій. Вершы напісаны пры дапамозе мужчынскіх і жаночых рыфм: багатых, бедных, дакладных, недакладных (асанансных і апорных). Як відаць, В. Вабішчэвіч пераняў уведзеную М. Багдановічам класічную форму трыялета, захаваўшы яе рысы. У паэта атрымалася прадоўжыць жыццё класічнага трыялета.

Беларусі “заўсёды суджана цвісці”, значыць, беларуская паэзія таксама будзе “цвісці”, развівацца, захоўваючы набытае, і ўзбагачацца новымі творамі, новымі формамі, новымі тэмамі дзякуючы прыходу ў беларускую літаратуру новых паэтаў з новымі поглядамі на жыццё, дзякуючы стварэнню імі непаўторнага мастацкага свету.

1. Багдановіч, М. Выбраныя творы / М. Багдановіч. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1996. – 494 с.

2. Вабішчэвіч, В. Кахаю і люблю : вершы / В. Вабішчэвіч. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 80 с.

3. Вабішчэвіч, В. ORBI : вершы / В. Вабішчэвіч. – Мінск : Канфіда, 2012. – 104 с.

4. Вабішчэвіч, В. Уражанне : вершы / В. Вабішчэвіч. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 60 с.

5. Вабішчэвіч, В. Чорны боль : вершы / В. Вабішчэвіч. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 61 с.

6. Заяц, Н.В. Трыялет Максіма Багдановіча: новы змест традыцыйнай формы / Н.В. Заяц // Матэрыялы Міжнароднай навук.-практ. канф. Да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча “Творчасць Максіма Багдановіча ў кантэкс-

це сусветнай літартуры” (25-26 ліст. 2011 г.). – Мінск: “Права і эканоміка”, 2011. – С. 122-125.

7. Рагойша, В. П. Трыялет / В. П. Рагойша // Максім Багдановіч : энцыклапедыя / склад.: І. У. Саламевіч, М. В. Трус ; пад навук. рэд. М. В. Труса. – Мінск, 2011. – С. 499.

## "I SAW A SIGN OF SKARYNA IN THE SKY": A CLASSIC TRILET BY VIKTAR VABISHCHEVICH

*Natalia Bazar*
*Polessky State University, Pinsk, Belarus*
*mikalaewa@gmail.com*

The article studies the genre form of intertextuality in the works of contemporary Belarusian poet V. Vabishchevich, who applies poetic achievements of M. Bogdanovich and expands the possibilities of Belarusian literature. Triolet V. Vabishchevich shows richness of author’s artistic means, his intellectual and creative potential.

***Keywords: genre, intertextuality, modern poetry, triolet, Victor Vabishchevich.***